# ПАДЧАШЫНСКІ КАРЛ ІВАНАВІЧ

К. І. Падчашынскі (1790-1860) — прафесар Віленскага ўніверсітэта, знакаміты архітэктар і вучоны-тэарэтык позняга класіцызму, заснавальнік рамантызму ў архітэктуры. Як і яго сучаснік — паэт Адам Міцкевіч, К. І. Падчашынскі непарыўна звязаны з культурай трох народаў — літоўскага, беларускага і польскага. Большую частку жыцця ён правёў у Літве, у Вільні; гаварыў і свае навуковыя працы пісаў на польскай мове, а ў роднай Беларусі пакінуў каштоўныя архітэктурныя творы, стварыў навуковыя працы.

К. І. Падчашынскі нарадзіўся 7 лістапада 1790 г. у в. Жырмуны Воранаўскага раёна. Яго дзед, Павел Пячун (Пяцюн), быў будаўнікам, рамантаваў драўляныя касцёлы і дваранскія сядзібныя пабудовы. Ён працаваў у Гродне, пазней пераехаў у Жырмунскі маёнтак Радзівілаў. Тут змяніў прозвішча на Пячунскі (ці Пячынскі). Яго сын Ян (бацька Карла) па хадайніцтву караля Радзівіла, прыкладна ў I772 г. падцвердзіў сваё шляхецтва, пасля чаго стаў называцца Падчашынскім.

Ян Падчашынскі (нарадзіўся каля 1735 г.) быў вучнем знакамітага прафесара архітэктуры Віленскага ўніверсітэта Лаўрынаса Гуцэвічуса. У жырмунскім маёнтку Радзівілаў ён займаў пасаду архітэктара і выканаўца будаўнічых прац. Менавіта па праекту Яна Падчашынскага і пад яго кіраўніцтвам у 1788- I789 гг. быў пабудаваны драўляны касцёл у Жырмунах. Жырмунскі касцёл да гэтага часу захаваў свой першасны аб’ём, фасады і без асобых змен – інтэр’ер у стылі позняга класіцызму. У гэтым касцёле быў ахрышчаны Карл Падчашынскі. Хроснымі бацькамі былі віленскі ваявода Юзаф Пац і жонка скарбніка ВКЛ Караліна Радзівіл. Бабка Карла, Мяжынская, адпісала ўнуку невялікі маёнтак — Чэхаўшчызну. Карл рана асірацеў: хутка пасля яго нараджэння памерла маці, а калі хлопчыку было 10 гадоў, памёр і бацька. Турботы пра хлопчыка ўзяў на сябе магнат Юзаф Тызенгаўз. Ён пасяліў Карла ў сваім доме ў Жалудку (зараз вёска ў Шчучынскім раёне), даў яму першапачатковую адукацыю.

У 1808 ці ў 1809 г. К. Падчашынскі накіраваўся на вучобу ў Крамянецкі ліцэй. Такім чынам, ён пакінуў родную Беларусь, але не назаўсёды. Скончыўшы ліцэй, Карл у 1813 г. паступіў у Віленскі універсітэт, а ўжо ў 1814-1816 гг. вывучаў архітэктуру ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. У 1817-1818 гг. ён удасканальваўся ў Парыжы, у знакамітага прафесара Жана-Луі Нікаля Дзюрана, а ў I819 г. вывучаў архітэктурную спадчыну Італіі.

Затым ён вярнуўся ў Літву і стаў прафесарам Віленскага ўніверсітэта, а таксама яго архітэктарам, пачаў інтэнсіўна займацца праектаваннем і навуковай дзейнасцю. Геаграфія яго архітэктурных праектаў ахоплівае шырокую прастору ад Санкт-Пецярбурга на поўначы да Камянец-Падольска на поўдні. Важнае месца тут займае Беларусь. 3 імем К.

Падчашынскага звязана будаўніцтва палаца ў Жылічах.

Праектаваў ён будынак школы ў Мазыры, але яна, на жаль, не была пабудавана. З удзелам К. Падчашынскага ўзводзіліся рззідэнцыя Гюнтэраў у Дабраўлянах, а таксама касцёл у Жалудку.

Адной з самых значных прац К. Падчашынскага стаў палац у Жылічах — рэзідэнцыі маршалка Бабруйскага павета Ігнацій Булгака. Архітэктура палаца ў Жылічах уяўляе вялікую каштоўнасць. Па праекту Падчашынскага быў пабудаваны яго усходні двухпавярховы корпус (пазней, у XIX ст. быў сфарміраваны палац закрытага тыпу з унутраным дваром). Аб'ёмная кампазіцыя палаца з бакавымі рэзалітамі і 4-павярховай вежай бельведэра даволі рэдкая для беларускага і літоўскага класіцызму. Бельведэр з'яўляецца прыкметай Італьянскага неарэнесансу. Яшчэ адно даволі арыгінальнае і рэдкае архітэктурнае рашэнне — тры порцікі (адзін цэнтральны і два бакавыя, для параўнання — Пакруойскі палац у Літве, першая чвэрць XIX ст., архітэктар невядомы). Асабліва ўласцівы творчасці К. Падчашынскага любімы ім карынфскі ордэр, які ён ужываў у афармленні фасадаў і інтэр'ераў.

Вялікай увагі заслугоўвае інтэр'ер палаца. Для ўнутранага ўпрыгожвання выкарыстана лепка, люстры, дэкаратыўныя вазоны, прыгожы паркет, кафельныя печы, каміны, кесонавая столь (апошняе таксама ўласціва творчасці К. Падчашынскага).

Вельмі прыгожа была дэкарыравана сталовая ў паўднёвым крыле палаца. Яе ўнутраная прастора падзелена дзвюма парамі карынфскіх калон на тры часткі. Цэнтральная прастора ўпрыгожвалася шырокай барэльефнай паласой з шматфігурнымі сюжэтамі. Белыя фігуры выдзяляліся на сінім фоне, карынфскія капітэлі былі пазалочаныя, калоны і пілястры імітаваныя пад чырвоны мармур. (У гады Савецкай улады палац быў моцна пашкоджаны. Зал сталовай быў перагароджаны, шмат дзе знішчаны паркет, каміны, печы, кесоны).

Значнае месца ў архітэктурнай творчасці К. Падчашынскага займалі праекты навучальных устаноў.

З 1824 г., будучы членам камітэта будаўніцтва школ Віленскай навучальнай акругі, а ў 1825-1826 гг. і візітарам, К. Падчашынскі добра ведаў спецыфіку школьных пабудоў, што дазволіла яму ствараць функцыянальна абгрунтаваныя праекты.

У Куножы, куды неўзабаве пераехаў К. Падчашынскі пасля закрыцця Віленскага універсітэта, ён мог свабодна займацца навуковай працай. Менавіта там у лістападзе 1839 г. ён закончыў кнігу "Архітэктанічная наменклатура, ці Слоўнік архітэктурных выразаў", дзе праз тэрміналогію абагульніў свой больш чым 20-гадовы вопыт будаўнічай і архітэктурнай дзейнасці. У І843 г. кніга была выдадзена ў Варшаве. У ёй аўтар прадставіў 630 тэрмінаў (з сінонімамі каля 900), якія скласіфікаваў на 17 раздзелаў. У 1854 г. на сродкі сына Баляслава яна выйшла другім выданнем. У другім выданні з'явілася больш чым 150 малюнкаў-мініяцюр, якія адлюстроўваюць будаўнічыя дэталі, інструменты, канструкцыі, архітэктурныя і

будаўнічыя элементы. Дзякуючы гэтаму, "Слоўнік" стаў вялікай каштоўнасцю для гісторыкаў архітэктуры і будаўніцтва. Аўтар "Слоўніка" асабліва шмат увагі ўдзяліў мясцовым тэрмінам. Ён падкрэсліў, што заўсёды лепш выкарыстоўваць старажытныя, напалову забытыя мясцовыя тэрміны, чым пазычаць іх з іншых моў.

У Куножы К. Падчашынскі працягваў працаваць і над галоўнай сваёй навуковай працай — "Асновы архітэктуры для акадэмічнай моладзі".

Яна была задумана ў 4-х тамах. Першыя два тамы выйшлі з друку яшчэ ў I828 і 1829 гг. Вядома, што ў 1838 г. быў закончаны тэкст трэцяга тома. У Куножы К. Падчашынскі ўдасканальваў і рыхтаваў рукапіс да выдання. Аднак для яе выдання, падрыхтоўкі ілюстрацый трэба было вярнуцца ў Вільню. Адчуваючы, што здароўе пагаршаецца і трэба спяшацца, К. Падчашынскі ў 1853 годзе пакінуў вёску. Некаторы час жыў у сына ў Варшаве, дзе лячыўся, аднак хутка разам з жонкай прыехаў у Вільню.

К. Падчашынскі цалкам прысвяціў сябе выданню манаграфіі. У 1856 г. у Вільні быў выдадзены трэці том. Аднак, з-за фінансавых цяжкасцей, ад чацвёртага тома аўтар вымушаны быў адмовіцца.

Апошнія гады жыцця К. Падчашынскі правёў у Вільні, дзе і памёр 7 красавіка 1860 г. Пахаваны ён на могілках Расу ў сямейнай магіле побач з жонкай.

Цяжка пераацаніць значэнне асобы і прац К. Падчашынскага для архітэктуры Літвы і Беларусі XIX ст. Гэта быў апошні карыфей класіцызму, прадаўжальнік будаўнічых традыцый Вялікага княства Літоўскага ўжо ў складзе Расійскай імперыі. На долю К. Падчашынскага выпала гістарычная місія завяршыць тут эпоху класіцызму.

Пытанні паходжання Падчашынскіх вывучаў літоўскі даследчык Стасіс Абрамаўскас.

**Бібліяграфія:**


1. Грицкевич, А.П. Древний город на Случи / А.П. Грицкевич. — Мн., 1965.
2. Грицкевич, А.П. Слуцк: историко-экономический очерк / А.П. Грицкевич. — 2-е изд. — Мн., 1970.
3. Жылічы // Гісторыя беларускага мастацтва. У 6-ці т. Т. 3. – Мінск, 1989. — С. 37.
4. Карл Падчашынскі // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 8. — Мн., 1975. — С. 20.
5. Карл Падчашынскі // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Воранаўскага раёна / рэд. кал.: Г.П.Пашкоў і інш.; маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2004. – С. 110.
6. Карл Падчашынскі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 4. — Мн., 1987. — С.143.
7. Карл Падчашынскі // Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік. —

Мн., I993. — С. 214.
8. Карл Падчашынскі // Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. — Мн., 1968.
9. Карл Падчашынскі // Гісторыя беларускага мастацтва. У 6-ці т. Т. 3. — Мн., I989. — С. 37, 105.
10. Карл Падчашынскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілеўская вобласць. — Мн.,1986. — С. 226—227.
11. Карл Падчашынскі // Белорусская ССР: краткая энцыклопедия. Т. 4. — Мн., 1981. — С. 228.
12. Карл Падчашынскі // Эпцыклапедыя літаратуры і мастацтва. Т. 2. — Мн., 1985. — С. 455— 456.
13. Карл Падчашынскі // Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік. — Мн., I993. — С. 448— 449.
14. Карл Падчашынскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. — Мн.,1986. — С. 144.
15. Карлюковіч, А. І векавечны толькі край … / А. І. Карлюковіч // Мінск, 2000. – С. 125.
16. Квитницкая, Е. Светские училища Белоруссии в первой трети 19 века / Е. Квитницкая // Архитектурное наследство. Т. 26. – Москва, 1978. – С. 83—84.
17. Коўкель, І. І. Караль Падчашынскі — архітэктар з в. Жырмуны / І. І. Коўкель // Славутыя людзі Воранаўшчыны. — Гродна- Нача, 1994. — 59 с.
18. Кулагін, А.М. Падчашынскі Карл Іванавіч / А.М.Кулагін // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X—XIX стагоддзі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 520.
19. Левандаўскас, В. Архітэктар Караль Падчашынскі і Беларусь / В. Левандаўскас // Беларускі гістарычны часопіс. — 1997. — № 2. — С. 187—195.
20. Ліхадзееў, У.А., Карлюковіч, А.М. Знічкі Айчыны: гісторыя Беларусі ў старых паштоўках / У.А. Ліхадзееў, А.М. Карлюковіч; паштоўкі У.А. Ліхадзеева. – Мінск: Литература и искусство, 2008. – С. 112—114.
21. Марозаў, В.Ф. Падчашынскі Карл Іванавіч / В.Ф. Марозаў // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 4. – Мінск, 1987. – С. 143.
22. Марозаў, В.Ф. Палац у Жылічах = Дворец в Жиличах (Фотаздымкі палаца (сучасны выгляд) выкананы аўтарам, астатнія Я. Булгакам каля 1914г.) / В.Ф. Марозаў. — Мн., 1992. — 76 с.: іл. — (Помнікі беларускага дойлідства).
23. Міцянец, Л.А., Кукуня, В.Р. Палацава-паркавы ансамбль / Л.А. Міцянец, В.Р. Кукуня // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобласць. – Мінск, 1986. – С. 226—227.
24. Міцянец, А.А., Шчарбатаў А.Г. Будынак мужчынскай гімназіі / А.А. Міцянец, А.Г. Шчарбатаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры

Беларусі: Мінская вобласць. Кн. 2. – Мінск, 1987. – С. 164—165.
25. Падчашынскі К. І. (7.11.1790 – 7.4.1860) // Асветнікі зямлі беларускай: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 317.
26. Палац у Жылічах. Магілёўская вобласць. Кіраўскі раён. Гравюра XIX ст. // Карлюкевіч, А. І векавечны толькі край / А.І. Карлюкевіч. — Мн., 2000. — С. 125.
27. Праект архітэктара К. І. Падчашынскага // Гісторыя беларускага мастацтва. У 6-ці т. Т. 3. – Мінск, 1989. – С. 37.
28. Родчанка, Р.В. Старэйшая школа Беларусі / Р.В. Родчанка. — Мн., I985.
29. Светозаров, Л. Знаменитые земляки: из истории Вороновщины / Л. Светозаров // Воранаўская газета. — 1996. — 24 студзеня. — С. 2.
30. Светозаров, Л. Знаменитые земляки: из истории Вороновщнны / Л. Светозаров // Воранаўская газета. — 1994. — 12 верасня. — С. 3.
31. Станкевіч, К. Станем пад яго сцягі: Да Дня пісьменства і друку / К. Станкевіч // Воранаўская газета. — 1994. — 3 верасня. — С. 1.
32. Фесенко, И. Знатные земляки: из истории Вороновщины // Воранаўская газета. – 1992. – 4 студзеня. – С. 3.
33. Чантурия, В.А. Архитектурные памятники Белоруссии / А.В. Чантурия. — Мн., 1982. — С. 210— 211.
34. Чантурия, В.А. История архитектуры Белоруссии / В.А. Чантурия. — Мн., 1977. — С. 259—261.
35. Чантурыя, У.А. Жыліцкі палац / У.А. Чантурыя //Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. У 5 т. Т. 2. – Мінск, 1985. – С. 455—456.
36. Чантурыя, У.А., Анціпаў, В.Р. Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль / У.А. Чантурыя, В.Р. Анціпаў // Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1993. – С. 214.
37. Шчыгла, Т.М. Падчашынскі Карл Іванавіч: 7 лістапада 2000 г. — 210 год з дня нараджэння знакамітага архітэктара з в. Жырмуны Воранаўскага раёна / Т.М.Шчыгла // Воранаўская газета. — 2000. — 25 кастрычніка. — С. 4.
38. Abramauskas, S. Is architekturosdestymoLietuvojeistorios / S. Abramauskas // Lietuvos TSR aukstujumokuklumokslodarbai – Architekturairmiestustatyba. – Vilnius, 1974. – № 3. – P. 80.
39. Urbanski, A. Memento Kresowe. – Warszawa, 1929. – S. 99—111.
40. Podczaszynski B. Wspomnienieposmertne // KurjerWilenski, 1860. – № 32—35. – S. 313.
41. Podczaszynski B. // KurjerWarszawski. – 1853. — № 265.